


**Маладзёжны адукацыйны клуб ”NEWLINE“**
**Маладзёжнае грамадскае аб’яднанне “Гісторыка”**
**ДУА “Гімназія № 10 г. Маладзечна”**
**ДУА “Політэхнічная гімназія № 6 г. Мінска”**

## НАША Беларусь: разам з Міхалам Клеафасам Агінскім
## 11 лістапада 2010 з 13.00 да 16.00 (Мінск)

## ЗАДАННІ ГУЛЬНІ

Калі ласка, уважліва прачытайце ўсе заданні гульні і выберыце з іх тыя, якія для Вас найбольш цікавыя і актуальныя. Выкарыстоўваючы методыкі міні-даследванняў і любыя даступныя Вам крыніцы інфармацыі, сфармулюйце свае варыянты адказаў на выбраныя пытанні. Пры афармленні заданняў, калі ласка, не забудзьце пазначыць усе крыніцы выкарыстанай інфармацыі (у тым ліку – адрасы сайтаў):

1. Міхал Клеафас Агінскі – сусветна вядомы кампазітар, знаны перш за ўсё праз аўтарства паланэзу "Развітанне з Радзімай", сам сябе выбітным музыкам не лічыў, бавіў за фартэпіяннымі практыкаваннямі часу не болей за сваіх сучаснікаў, і нават такой пазнавальнай назвы свайму самаму знакамітаму паланэзу не даваў, а падпісаў яго проста: ля-мінор. Між тым, лічыў ён сябе дзеячам дзяржаўным. І як палітык пакінуў гісторыкам спадчыну, не меншую за музычную: дэпутат сойму Рэчы Паспалітай і сенатар Расійскай імперыі, удзельнік паўстання Тадэвуша Касцюшкі і дарадца Аляксандра І. Міхал Клеафас Агінскі то з'язджаў у Заходнюю Еўропу, то зноў вяртаўся да родавых маёнткаў. Як вы лічыце, што яднае ўсе гэтыя ягоныя, на першы погляд, супярэчлівыя ўчынкі?

2. Праз стаўленне і ўчынкі канкрэтных асобаў складваецца характар нацыі. Ад нашых учынкаў разам і паасобку залежыць тое, як будуць выглядаць нашыя вуліцы, дзейнічаць нашыя законы, якую музыку будуць слухаць людзі, на якой мове размаўляць. Але найвялікшы ўплыў на лёс краінаў і нацый мае дзейнасць гістарычных асобаў, сярод якіх вылучаюцца вялікія людзі. Як вы лічыце, кім для нас з'яўляецца Міхал Клеафас Агінскі? Чалавекам, які жыў у час, калі ягоная дзейнасць змагла

рашучым чынам паўплываць на лёс нашай краіны? Які ланцужок падзеяў (рэгіянальных, нацыянальных, міжнародных) ад 18 стагоддзя да цяперашнега часу мог бы не адбыцца, калі б раптам М. К. Агінскі цікавіўся выключна кулінарнымі стравамі, ці толькі музыкай, ці, да прыкладу, садаводствам?

3. Уявіце, што вы працуеце над стварэннем мастацкага фільма пра лёс Міхала Клеафаса Агінскага. Лічыцца, што кожны добры мастацкі твор нясе ў сябе нейкае "пасланне" – message. Якое пасланне вы б хацелі перадаць сваім фільмам? Чым бы мог вобраз Агінскага ў вашым фільме дапамагчы сучаснаму пакаленню? Пошуку адказаў на якія важныя сёння пытанні паспрыяў бы? На што б вы хацелі звярнуць увагу гледача? Якія б эпізоды з жыцця Міхала Клеафаса Агінскага вы б уключылі ў гэту стужку? Які жанр вы б абралі для таго, каб лепей раскрыць яго асобу?

4. Сваёй радзімай Міхал Клеафас Агінскі лічыў Рэч Паспалітую – краіну, спадкаемцамі якой сябе лічаць многія краіны сучаснай Еўропы. За сваё жыцце Міхал Клеафас Агінскі паўдзельнічаў у вялікай колькасці вызначальных падзей свайго часу: Вялікім і Нямым соймах Рэчы Паспалітай, паўстанні Касцюшкі, дыпламатычных місіях у Лондане, Гаазе, Парыжы, Стамбуле, Рыме, Венецыі, Неапалі, Вене, Берліне, Санкт-Пецярбургу. Паспрабуйце ўявіць, што маглі б сказаць пра асобу і дзейнасць Агінскага: а) яго сучаснікі (напрыдклад, Т. Касцюшка, расійскі імператар Аляксандр I і імператар французаў Напалеон I, інш.), б) нашы сучаснікі – прадстаўнікі Польшчы; Расіі; Украіны; Літвы; Беларусі.

5. Прапануйце, калі ласка, маршрут экскурсіі, прысвечанай Агінскаму. Прадумайце яе мэту, магчымых экскурсантаў і ўдзельнікаў, паслядоўнасць фактаў і пунктаў. Чаму нададзіце больш увагі? Пра што і з дапамогай чаго вы будзеце распавядаць пра асобу і жыццё Міхала Клеафаса Агінского для вашых экскурсантаў?

Калі ласка, не забудзьце падпісаць свае варыянты выкананых заданняў гульні. Пазначце:
- *імя каманды, Вашу школу альбо арганізацыю;*
- *імёны, клас і ўзрост усіх удзельнікаў Вашай каманды;*
- *імёны педагогаў і ўсіх дарослых і сяброў, якія былі Вашымі памочнікамі падчас гульні.*

УВАГА: *калі ласка, не забудзьце, што свае адказы вам неабходна адправіць сёння да 16.00 на ЎСЕ пазначаныя тут адрасы адначасна:* newlineclub@gmail.com, yiecnewline@gmail.com, p_and@tut.by *(проста скапіруйце іх у радок электроннага ліста «каму»).*

*Просім вас разам з адказамі на заданні гульні даслаць таксама фатаздымкі і рэпартажы аб удзеле вашай каманды ў праекце.*

ОНЛАЙН ПАДТРЫМКА І КАНСУЛЬТАЦЫІ
З 13.00 да 16.00 (Мінск) праз email: yiecnewline@gmail.com, skype: ourbelarus, icq: 636455758.

Спадзяемся, што наша супрацоўніцтва было для Вас плённым і мы зможам працягнуць яго падчас экскурсіі і майстар-класа **«Агінскі сярод нас»** (*арыентыровачна – 20-21 лістапада 2010 года*).

Дзякуй за Ваш удзел у гульні.
*Арганізатары Нацыянальнай Інтэрнэт-гульні* ***"НАША Беларусь: разам з Міхалам Клеафасам Агінскім"***